ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

25 сьнежня 1931 г. № 340 (1565)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

У дні ўсесаюзнага сталінскага паходу

За поўнае выкананьне пляну 3-га рашаючага

ГАНАРОВЫ СЬПІС

На ганаровы сьпіс заносіцца комсамольская брыгада менскай фабрыкі „8 сакавіка", якая на глебе рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва выканала прамфінплян IV кварталу на 11 дзён раней тэрміну.

* * *

Комсам. брыгада у першых падрыхтоўкі да IV пленуму ЦК ЛКСМБ шырока разгарнула працу па сталінскаму паходу і ў барацьбе за колькасныя і якасныя паказчыкі прамфінпляну дабілася бліскучых посьпехаў—датэрміновага выкананьня вытворчага пляну.

5 дзён засталося да канца 3 рашаючага



13 СЛАЎНЫХ ГАДОЎ БАРАЦЬБЫ

Мінула 13 гадоў. Але сьвежы і не забыты для ленінскага комсамолу гэтыя гістарычныя даты яго ўзьнікненьня, не забыўны першыя крокі змаганьня і барацьбы. Незгладжальна ўражаньне гэроікі, самаадданасьці, нястрымнага рэволюцыйнага запалу, якімі вызначаліся юнакі ў бязьлітаснай барацьбе пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі з контррэволюцыяй, з клясавымі ворагам.

Быў 1918 год... Маладая, рэспубліка саветаў была ў агні і полымі, у кальцы сусьветнай контррэволюцыі. З кожным днём тужэй сьціскалася кольцо. Варожная зграя наймітаў сусьветнай буржуазіі імкнулася зруйнаваць маладую рэспубліку.

І вось у гэтыя дні, дні грымотных грамадзянскіх боек, узьнікаюць першыя комсамольскія організацыі Беларусі. З 15 сьнежня пачынае сваё існаваньне Менская комсамольская організацыя. Крыху пазьней—Віцебская, Магілеўская, Бабруйская і інш. Нарэшце, 20 сьнежня, у горадзе Смаленску быў склікан першы зьезд КСМ.

Асноўнай, цэнтральнай задачай, ўстаўшай ў той час для комсамольскай організацыі зьяўлялася—барацьба за атрыманьне савецкае ўлады, усямерная падтрымка Чырвонай арміі, ўзмацненьне яе баяздольнасьці. Вось чаму зусім не выпадкова ў сваіх рашэньнях першы зьезд КСМ запісаў—„Аддаць усе сілы, усё лепшае, што ёсьць у комсамольскай організацыі вялікаму змаганьню за комунізм, за канчатковае вызваленьне рабочае клясы ад капіталістычнага ўціску".

І гэта была ня толькі пастанова.

Комсамол Беларусі не шкадаваў сваіх лепшых сіл. Для абароны дыктатуры пролетарыяту, для ўтрыманьня ўлады саветаў даваў сваіх лепшых сыноў на калчакоўскі, і на дзянікінскі, на ўрангельскі, а потым і на польскі фронты. І ўсюды яны зьяўляліся першымі змагарамі, сваім прыкладам, самаадданасьцю натхнялі ас-татніх байцоў.

Калі Беларусь была акупавана беларалякамі, загнаная ў глыбокае падпольле комсамольская організацыя не спыніла дзейнасьці. Праз разгорнутую агітацыйную работу, праз спэцыяльныя адозвы да рабочай і сялянскай моладзі комсамол заклікаў:

„Ідзі туды, дзе сумленна змагаюцца і паміраюць твае старэйшыя браты, дзе за пававаньне рэволюцыі, за вольнае, шчасьлівае жыцьцё льлецца кроў лепшых сыноў рабочых і сялян".

У адкрытых бойках з ворагам рос і гартаваўся ленінскі комсамол.

З тых дзён у комсамольскай організацыі адбыліся агромністыя зьмены. Комсамол ператварыўся ў шматмільённую організацыю. У прыватнасьці комсамольская організацыя Беларусі мае зараз у сваіх радох да 180 тыс. комсамольцаў. Фронт грамадзянскіх боек замяніла цяпер упартае змаганьне з клясавым ворагам, з рэшткамі ўнутраной контррэволюцыі —фронт соцыялістычнага будаўніцтва.

На слаўных традыцыях ленінскага комсамолу павінна выхоўвацца 180 тысячная армія комсамольцаў і ўся працоўная моладзь. Гэта з усёй рашучасьцю абавязвае нас абагуліць увесь вопыт барацьбы комсамолу. Мы павінны прыступіць без адкладна да напісаньня сапраўднай бальшавіцкай гісторыі комсамолу, павінны як мага хутчэй ускрыць памылкі, дапушчаныя ў тых матар'ялах якія ўжо ёсьць аб комсамоле.

Сёньня ленінскі комсамол ля ўдарных варштатаў, на рыштаваньнях разам з усім пролетарыятам аддае ўсе свае сілы, усе здольнасьці вялікай будоўлі. Але ў любую хвіліну, калі гэта будзе патрэбна, ленінскі комсамол гатоў стаць зноў пад вінтоўку і з усёй ярасьцю абараняць межы бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту.


Зараз усе капіталістычныя краіны ахоплены сусьветным экономічным крызісам. Сотні тысяч беспрацоўных пролетараў выкінуты капіталістымі на вуліцу паміраць галоднай сьмерцьцю. Іх лік няспынна расьце, прапарцыянальна колькасьці збанкрутаваных прадпрыемстваў, трэстаў. На гэтым фоне вылучаюцца асабліва цяжкія ўмовы жыцьця пролетарскай моладзі ў капіталістычных краінах: беспрацоўе, непамерная эксплёатацыя. Унадзвычай дрэнных абставінах жыве моладзь Заходняй Беларусі і Польшчы. Толькі за апошнія гады фашысцкі ўрад белапанскае Польшчы закатаваў сотні лепшых сыноў комуністычнага руху. Турэмныя краты, шыбеніцы, ссылкі, жудасныя з дзекі скарыстоўваюцца пілсудчыкам, каб толькі спыніць рэволюцыйны рух. Але нішто не дапамагае.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі Заходняй Беларусі і Польшчы організоўваюцца ў узброеныя партызанскія атрады.

Выхад з крызісу капіталістычныя краіны шукаюць у падрыхтоўцы новай імперыялістычнай бойкі, у першую чаргу нак раванай супроць краіны Саветаў. Вось чаму зараз як ніколі мы павінны біць на-чаку, трымаць порах сухім.

13-я гадавіна ЛКСМБ супадае з заканчэньнем 3-га рашаючага году пяцігодкі, з работамі па заканчэньню пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі, 13-ю гадавіну ленінскага комсамолу Беларусі мы павінны адзначыць праверкай нашай вайсковай баяздольнасьці, узмацненьнем інтэрнацыянальнай сувязі з моладзьдзю капіталістычных краін, практычнай рэалізацыяй 6 указаньняў правадыра нашай партыі т. Сталіна, узмацненьнем работы па організацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў, на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва

> „ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ І КІРУЕМАЯ ІМ РАБОЧАЯ МОЛАДЗЬ УВЕНЧАЛІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА РАШАЮЧЫМІ ПОСЬПЕХАМІ"
>
> (Сталін)



1920 год — 500 комсамольцаў з Менску, Віцебску, Магілева, Мазыра, з фабрык і заводаў супроць белагвардзейскіх банд, супроць Калчака, на польскі фронт.

1929-30 г. — Прарыў у Донбасе. Донбас кліча кадры. 3000 комсамольцаў на вугальны фронт пасылае комсамол Беларусі.
На далёкі Сахалін на замацаваньне савецкіх межаў звыш 300 лепшых з лепшых кідае ЛКСМБ.

1931 год — Кадры тарпянаму Донбасу. 800 комсамольцаў у тарпяны Донбас на поўнае выкананьне пляну торпаздабычы дае комсамол.
На ўсіх франтох, як і ў 1920 г., ЛКСМБ, верны традыцыям ленінскай партыі, змагаецца за яе лінію.

МЫ ВЫРАСЬЛІ Ў ПОЛЫМІ, У ПАРАХАВЫМ ДЫМУ

13 год назад, у агнёвыя, насычаныя порахам дні нарадзіўся адзін з баявых атрадаў УсеЛКСМ—комсамол Беларусі. У час грымотных боек грамадзянскай вайны ў саюз прыходзілі сотні і тысячы юнакоў і праз некалькі дзён накіроўваліся на фронты. Ня было такога баявога вучастку, куды-б ня кідаліся юнакі. У комсамольскіх організацыях асноўнымі лёзунгамі ў тыя дні былі: „Кожны комсамолец павінен аўладаць зброяй", „Усе комсамольцы, якія дасягнулі 15-гадовага ўзросту, павінны займацца вайсковаю справай".

У барацьбе за дыктатуру пролетарыяту не адзін дзесятак лепшых яго сыноў загінуў на калчакоўскім, юдзеніцкім, дзянікінскім, белапольскім франтох, з бандамі Махно, Марусі, Мамантава Зялёнага Булак-Балаховіча і Савінкава.

Гаршан, Гатоцкі, Кастроль, Ратнэр, Дварэцкі —вось прозьвішчы гэроічных абаронцаў Менску ад варожага нападу.

У 1920 г. калі адбівалі атаку белапалякаў на Менск, загінуў адзін з організатараў комсамолу—тав. Флакс.

Гэты сьпіс можна было-б працягнуць.

У дзень сьвяткаваньня 13 гадавіны ЛКСМБ, якая супадае з днём завяршэньня фундаманту соцыялістычнай экономікі, —слова аб тых „старых", што жывуць і змагаюцца на гаспадарчым перакопе. Іх мала. Гэтых „старых" амаль ня знойдзеш на комсамольскай рабоце. Загартаваныя ў падпольлі, на грамадзянскіх фронтах пад градам куль і знарадаў, яны зараз—у руля кіраўніцтва, на адказьнейшых вучастках народнай гаспадаркі. Вось Кауман Штэйман—адзін з організатараў менскай комсамоліі і адзін з першых сэкратароў комсамольскай ячэйкі гарбарні „Бальшавік", зараз—старшыня ЦП саюзу гарбароў. Кантаровіч—стары комсамолец—зараз старшыня заводзкага камітэту чырвонаштандарнага „Бальшавіка", які з гонарам выканаў сваю пяцігодку ў 3 гады. Рацэс—адзін з старых комсамольцаў магілеўскай організацыі—зараз дырэктар менскага хімфармзаводу. Сімунін—адзін з старых комсамольцаў Віцебску—зараз дырэктар ФЗВ мэталістых гор. Віцебску.

Старая комсамолка Вера Хоружая суджана на 8 г. катаргі ў Польшчы

Пад кіраўніцтвам партыі, у барацьбе з рознымі адхіленьнямі ад яе генэральнай лініі,—комсамол змагаўся на грамадзянскіх фронтах і зараз змагаецца на ўсіх вучастках соцбудаўніцтва.

Слова—старому комсамольцу магілеўскай організацыі—т. Зіскіну

... У першых лічбах лістапада 1918 году партыйны камітэт г. Магілева вылучыў групу таварышоў для работы сярод працоўнай моладзі. Дом Працы (раней грамадзянскі клюб) быў арэнай нашай першапачатковай дзейнасьці. Там часта скліка-ліся мітынгі і сходы моладзі.

У момант стварэньня магілеўскага комсамолу было 32 перадавых рабочых падлеткаў. Праз 4-5 месяцаў організацыя падвоілася.

Энтузіязм комсамольцаў быў вялізарны. Ня гледзячы на цяжкую дзенную працу ў саматужніка гаспадара, ніхто не адмаўляўся пайсьці паўбосым у начную варту.

Асабліва памятна першая комсамольская мобілізацыя. Бурны сход комсамольцаў. Абгаварвалі цыркуляр ЦК РКСМ аб пасылцы 50 проц. організацыі на калчакоўскі фронт. Кожны з прысутных дабраахвотнікам хацеў ісьці на фронт, каб не застацца ў тыле. 14 гадовым хлапчуком я пашоў у Губком партыі скардзіцца, чаму мяне не бяруць на фронт. Маю просьбу здаволілі.

Дзень адпраўкі на фронт ператварыўся ў масавую дэмонстрацыю. Увесь горад вышаў на провады комсамалят. Мне ўспамінаецца цікавы малюнак: комсамольцу Ізраільскаму было адмоўлена ў пасылцы на фронт. У дзень адпраўкі ён схаваўся ў адной з цяплушак, і толькі ў горадзе Дарагабужы выкрылі яго. Але было позна адпраўляць яго назад. У Магілеў я вярнуўся толькі ў 1922 годзе.

У бой навальнічны--партыя кліча

Сёньня комсамолія Савецкай Беларусі сьвяткуе 13-цігодзьдзе свайго існаваньня і 10-цігодзьдзе літаратурна - політычнай дзейнасьці аднаго з шматлікіх сваіх выхаванцаў, — пролетарскага поэты Андрэя Александровіча

Раўненьне—на таварыша Андрэя!

Комсамолії Савецкае Беларусі—13 год. Сотні і тысячы лепшых сваіх сыноў паслаў комсамол на рознастайныя вучасткі нацыянальна - культурнага будаўніцтва.

Беларуская пролетарская літаратура— гэтых адказнейшы вучастак нацкультбудаўніцтва вострая зброя партыі і рабочае клясы ў барацьбе за социялізм, — атрымала вялізарныя перамогі. Комсамол, даўшы сваіх лепшых сыноў на літаратурны фронт, да дня сваёй 13-й гадавіны пачынае сам прымаць непасрэдны ўдзел у стварэньні вялікага бальшавіцкага мастацтва.

Поэта-бальшавік, аўтар баявых песень нашай эпохі — Андрэй Александровіч, дзесяцігодзьдзе літаратурна-політычнай дзейнасьці якога ў гэтыя дні сьвяткуе наша краіна, прышоў змагацца за гегемонію пролетарскай літаратуры комсамольцам.

З 1922 году ў комсамоле, адказны рэдактар комсамольскага часопісу „Малады араты“ дэлегат двух усебеларускіх зьездаў ЛКСМБ, а пазьней —організатар „Маладняка“, і сёньня член БелАППА, адказны сэкратар МенАПП, член ЦВК БССР—гэтакія кароткія, але надзвычай красамоўныя рысы пройдзенага шляху таварыша Андрэя—члена комуністычнай партыі.

Літаратурна-політычная дзейнасьць т. Александровіча для шматтысячнай арміі маладых бальшавікоў Беларусі зьяўляецца лепшым узорам аддаңае барацьбы пад штандарам ленінскай партыі за справу рабочае клясы, за социялізм.

Літаратурна-політычная дзейнасьць т. Александровіча — узор бязьлітаснай барацьбы ленінскага комсамолу за генеральную лінію партыі.

У дзень трынаццатай гадавіны ЛКСМБ мы гаворым комсамольскай плеядзе пролетарскай літаратуры, усяму літаратурнаму маладняку; — раўненьне на т. Александровіча!

Ад т. Александровіча ленінскі комсамол вымагае яшчэ больш рашучай барацьбы за партыйнасьць у літаратуры, за вялікае бальшавіцкае мастацтва, за комсамольскую тэматыку.

Перад ЛКСМБ на 14-ы год барацьбы пад штандарам партыі, стаіць задача: мацаваць сувязь, мацаваць супрацоўніцтва з пролетарскім літаратурным рухам, яшчэ больш актыўна змагацца за рэалізацыю літаратурна - політычнай лініі партыі. Гэта адна з важнейшых задач удзелу ЛКСМБ у нацыянальна-культурным будаўніцтве.

ПОЭТА РАБОЧАЕ КЛЯСЫ

(З дакладу т. Бэндэ на ўрачыстым пасяджэньні ў Дзяржтэатры, 18 сьнежн

Творчасьць Андрэя Александровіча —нашага сёньнешняга, юбіляра— зьяўляецца вельмі важным чалавечым дакумантам пра тое, як вызваленыя Вялікім Кастрычнікам ад падвойнага социяльнага ўціску працоўныя масы былой „акраіны“—Беларусі—здольны праявіць ня толькі энтузіязм і гэроізм у змаганьні супроць сваіх клясавых ворагаў на франтох грамадзянскай вайны, у партызанскіх атрадах, на фронце пераможнага социялістычнага будаўніцтва, але і праявіць нябачаны ў гісторыі дзёрскі ўчынак заваяваць культурныя вышыні, заваяваць „сьвятыні“ мастацтва, поэтычнай творчасьці, усё тое, што было



раней прывілеяй і монополіяй пануючых кляс і іх прыслужнікаў.

Разбіла рэволюцыю паўстаньне,
А рэволюцыя і нашу краіну.

Беларусь Савецкая, Беларусь социялістычная не адрадзілася з-пад „мугоў поэцкіх капліц“, а нарадзілася ў буры змаганьня рабочых і сялян, пад сьцягам комуністычнай партыі, пад сьцягам Леніна.

Социялістычная рэволюцыя разгарнула шырокія прасторы, стварыла ўсе патрэбныя аб'ектыўныя ўмовы для таго, каб працоўныя масы „зусім сьвядома пачалі тварыць сваю гісторыю“ (Энгельс)

Рабочая кляса нашай краіны, кіруючы мільённымі масамі сялянства, пераможна будуе социялізм, перабудоўвае людзкую прыроду.

Жыцьцё ідзе праз петлі-перашкоды
Жыцьцё ідзе, зьнішчаючы закон,
І формы, створаныя спакон
Вякоў прыродай...

Рушыць на сваім пераможным шляху.

Юбілей Александровіча, аднаго з буйнейшых, аднаго з самых кваліфікаваных—на сёньнешнім узроўні пролетарскай літаратуры—інжынэраў пролетарскай поэзіі—зьяўляецца ў той-жа час і юбілеем-аглядам творчых дасягненьняў усёй пролетарскай літаратуры Беларусі.

Пролетарская літаратура расла і разьвівалася ў жорсткай клясавай барацьбе, якую вяла і вядзе рабочая кляса пад ленінскім кіраўніцтвам комуністычнай партыі за сваю дыктатуру, а яе замацаваньне, за пабудову социялізму, за перабудову ня толькі социяльнага быцьця працоўных, але і за перабудову іх самых.

Пролетарская літаратура на працягу ўсёй сваёй гісторыі заўсёды зьяўлялася ў меру свайго разьвіцьця зброяй у руках сваёй клясы, у яе барацьбе супроць клясавага ворага, супроць сіл і традыцый старой грамады

Нашаму юбіляру, Андрэю Александровічу, належыць на сучасным этапе пролетарскай літаратуры адно з першых месц у авангардзе беларускага пролетарскага літаратурнага руху.

Сіла і мастацкі ўзровень пролетарскай літаратуры знаходзяцца ў простай залежнасьці ад узроўню і глыбіні тых ідэй, якія выражаны ў творах.

Жыцьцё зьмяняецца, — зьмяняюцца
ідэі

Вось выходны пункт Александровічавай творчасьці апошніх год.

Наш рост у яго супярэчнасьцях, нашы перамогі ў актыўнай клясавай барацьбе па социялістычнай рэконструкцыі ўсіх бакоў нашага жыцьця, барацьба за перабудову людзкога матэрыялу, адміраньне старога і нараджэньне новага социялістычнага, гэроіка і патос барацьбы за новыя комуністычныя формы працы—вось далёка няпоўнае пералічэньне тых ідэй, якімі напоўнена творчасьць Александровіча за апошнія гады.

Гады сучасныя, бурныя годы!
Гартаванай сілай, агнём расьцьвілі.

Характарызуе поэта наш час у рамане „Нараджэньне чалавека“.

Поэта падыходзіць да аб'екту сваёй творчасьці не як „любознательный“ малады чалавек, які стаіць збоку і „вышобектыўна“ пагдядае на барацьбу рабочае клясы і замалёўвае яе ў свае нудныя радкі—накшталт такіх вось.

А цяпер вось, поўных творчых дум
і сіл,
Спатыкаю раньне, першы раз ў
жыцьці.
Ах (грымайце мяне!) якое сонца,
яркі поўдню цьвет,
Па табе заплакаў (якая трагэдыя!)
першы раз поэт
Дык, гары-ж, як сонца стамільёных
мас,
Я вітаю першы й мо' апошні раз.
І туманным шляхам (сп'яна, ці
што?) на ружовы шлях
Падпіхаю трактар, твой жалезны
птах,
(В. Маракоў, Полымя № 3),

Такі падыход Александровічу чужы, а ён адчувае сябе органічна неадлучнай часткай клясы, якая змагаецца, якая перамагае, якая радуецца сваім перамогам.

Як ня славіць песьняй сакалінай
Беларусь рэспубліку сваю.
Краіна, родная, савецкая краіна,—
Табе у песьнях сэрца аддаю.
Ты красуеш ростам рыштаваньняў,
Творчай працай гартаваных сіл,
Ты ў агні шчасьлівага сьвітаньня,
Быццам равіцай
На ўсходзе небасхіл
(„Цені на сонца“).

Але Александровіч ня выпускае з-пад увагі таго, што росквіт краіны ідзе праз перамаганьне жорсткага супраціўленьня клясавых ворагаў, праз перамаганьне сіл і традыцый старога, струхнелага, таго, што наш рост, наш рух па социялістычнаму шляху ёсьць „натуральна-гісторычны процэс“,

Змаганьне—жыцьцё. І каб жыцьцё
то змагацца
Стагодзьдзямі ўслаўлены сьмелы
закон.
З сабой, з чалавекам, з прыродаю,
з працай—
Змагацца для славы наступных
дзён.
(„Нараджэньне чалавека“, 104).

Александровіч заўважае ня толькі супярэчнасьці нашага росту па лініі клясавых супярэчнасьцяй, ён бачыць і тое, што на пэўным папярэднім этапе социялістычнага будаўніцтва былі супярэчнасьці і другога парадку, супярэчнасьці, якія вынікалі на базе неадноўленага, неразгорнутага яшчэ таго разьбітага матэрыяльнага, быцьця, якое нам засталося ў спадчыну ад капіталізму, які перад сваім канцом, падобна Плюшкіну, пабіўшаму перад сьмерцю ўсю сваю пасуду —разбурыў гаспадарку.

Гэтая супярэчнасьць выражана Александровічам у адным з момантаў гісторыі нараджэньня Марылі ў романе „Нараджэньне чалавека“.

А горад стаў інакшым, непадоб
У ім нязвычны рух,
І радасьць новых слоў,
О, ты, Марылін лёс!
Чаму яна галоднай
Ідзе сярод квітнеючых садоў?

Увесь гэты складаны і
[...]рэчлівы клубок, у якім не
[...]сьменьнік заблытаўся, гэтыя суп
насьці нашага руху, нашага ро
Александровіч адчувае, бачыць,
кнецца іх пазнаць, асмысьліць і ад
травацъ праз вобразы, праз ры
сваёй поэзіі.

Аднак, мастацкае пазнаньне і ад
траваньне бываюць розныя. Быва
кое, што далей эмпірычнага, павяр
вага, таго толькі што кідаецца ў
чы, ня ідзе, застывае, альбо безд
можна барахтаецца ў сьпляценьні
пярэчнасьцяй, як у зачараваным ко

Александровіч у сваіх творах ап
ніх гадоў, у такіх творах, як „Ц
на сонцы“ і „Нараджэньне чалав
„Напор“ і шэрагу вершаў раней
часоў, не абмяжоўваецца пасыў
сузіраньнем і аб'ектывісцкім ры
адлюстраваньнем рэчаіснасьці, а
кнецца пазнаць і мастацка раскр
асновы, прычыны, шляхі перамаг
ня супярэчнасьцяй.

Былі сталецьцямі ў карытах с
рэньнях.
Майстэрні дробныя раскіданы ў
вулках.

А цяпер, пры панаваньні рабо
клясы, пад кіраўніцтвам ленінск
партыі краіна перабудоўваецца, бу
ецца нанава.

З балот
У гарады
Пабеглі праваны,
Загудзелі поўным ходам
Гмахі фабрык і заводаў. (Поэма
вызваленьня)

У гэтым бачыць Александровіч
лучае, што ператварае краіну „м
стэрняў дробных“ у краіну сталі
наў, у колгасную краіну.

Праца зьяўляецца тэй асновай
пачаткам, шляхам якога перамагаю
супярэчнасьці, неўпарадкаванасьц
цыяльнага быту асоб з працоўн
асяродзьдзя.

Я шукаю шчасьця
Шчасьце—гэта праца
гаворыць Марылька ў рамане „На
джэньне чалавека“.

Асновай асноў, адзіна магчым шляхам пазбаўленьня ад ворага ад спадчыны мінулых гадоў, Александровіча, як і для ўсё рабо клясы, для ўсіх у мінулым прыгне ных і эксплёатуемых—зьяўляецца тыўная, непрымірымая клясавая рацьба ў розных яе формах.

Тварцоў
пакаленьня—
на здраду,
на цені,—
у бой навальнічы
Партыя кліча! („Цені на сонцы“,
На гэтую клясавую барацьбу за
кае творчасьць Александровіча.

На фронт, таварышы!
На фронт, энтузіясты!
. . . .
ў барацьбе, за працаю
Штодзень сабе прыблізім
Заваяваны
ў баёх
Социялізм.
(„Н. Ч.“, 123)

У гэтай нясупыннай і жорсткай рацьбе творыцца ня толькі но быцьцё, новыя ўмовы людзкога іс ваньня, але творыцца і новы чала энтузіяст, барацьбіт, які ня сьлепа гаецца, а „сьвядома творыць св гісторыю“.

Толькі ў актыўнай рэволюцый практыцы бачыць Александровіч ш і спосаб пераробкі людзей, нараджэ ня ў іх социялістычнага ўсьведамле ня, усьведамленьня таго, што за социялізм не зьяўляецца сама леючым, абстрактным індывідуума неадлучнай, органічнай часткай ко тыву барацьбітоў, якія перабудоўв юць сьвет.

Паняцьце новага чалавека, ідэя, якую змагаецца ў сваёй творчас Александровіч, ня мірыцца з мяшч скім, абывацельскім, дробнабуржуа ным хныканьнем, штопаньнем і лат нем жыцьця.

Хныкаць, і штопаць, і латаць жыц
цё—
Маруднае самазабойства.
Ветрам дзьмі, распаляй касьцёр
Думак, імкненьняў, геройства.
(стар. 82)

Бо жыцьцё—змаганьне, такі ужо за кон гісторыі чалавецтва, а таму поэ лічыць, што

Мала радзіцца,—будзь цьвёрды
як камень.
Любою істотай умей заўладаць.
Тысячы дышуць такімі грудзямі.
Сэрца тваё—грамада!
(„Нараджэньне чалавека“ 104)

У гэтым сіла, гэта тое новае, больш вышэйшае, што прынёс з сабою но этап у разьвіцьці творчасьці Александровіча.

Андрэй Александровіч

Сілай магутнаю рушымся біцца...

(Урывак з п'есы „Напор“*)

Мішка:
Мне здаешца, дзень, ці два
З вамі я ня быў, братва.
А два гады...
Сенька:
Яно кароткім
Час здаецца нам заўжды.
Галька:
Дзіву даўся, пяцігодка—
Прабягае ў тры гады.
Мішка:
У тры гады... А вы,
Ці здолелі змагацца,
Каб стаць ударнай працай
Пад сьцяг перадавых?
Мінула два гады
Вялікіх,
Векапомных,
На зломных
Два гады.
Базыль:
Яшчэ і Маркс казаў калісь—
На многа ўперад не пайшлі.
Галька:
А ўсё-ж мы зрух вялікі маем.
Чыж:
Бяз толку, што апелкі
Жывем і... падганяем
Базыль:
Слухай, Мішка, нам тым часам,
Як сказаў і Энгельс Марксу,—
Працы ёсьць!
Сенька:
Хоць з носу кроў.

*) П'еса „Напор“—новы, буйнейшы твор поэты,—адлюстроўвае гэроічнае змаганьне комсамолу пад кіраўніцтвам партыі, на франтох социялістычнага будаўніцтва.

Базыль:
Завод наш мусіць даць Данбасу
Стандартных тысячу дамоў.
Галасы (як водгук):
Стандартных... тысячу... дамоў.
Сенька:
Рэспубліцы патрэбен вугаль.
І пад зямлёй, ад зор да зор,
За зьменай зьмена ўдарным
кругам
Шахцёра зьменьвае шахцёр.
Пасьля напружнай, цяжкай
працы
Кватэра ўдарніка—барак.
Васіліса:
І мы,—што сіл павінны ўзяцца
Будынкі выслаць!
Галасы:
Час! Пара!
Галька:
Я знаю, знаю вышлем мы
У Донбас патрэбныя дамы.
Базыль:
Кавалі выклікаюць нас—
Праграму ўдарную ў адказ.
Мішка:
Перавыканаць?
Чыж:
Раз.
Базыль:
Зьніж сабекошт, хоць прэч галава.
Чыж:
Два.
Базыль:
Якасьць уверх, а брак з гары.
Чыж:
Тры.
Базыль:
І яшчэ, і яшчэ, і яшчэ!
Мішка:
Працаваць, працаваць, працаваць!

Чыж:
І чатыры, і пяць, і шэсьць!
Галька:
Мы ў намаганьні.
Першымі станем.
Васіліса:
І прэмію—знаем—
Грамада:
Мы атрымаем!
(уся грамада пяе)

Здымем адвечную цьвіль,
Здымем вякоў павуціну.
Поступам нашым нястрымным.
Новыя тысячы міль
Браць мы штодзённа павінны.
Сілай магутнаю рушымся біцца—
У бой—
Грамадой,
Штурмавой,
Бальшавіцкай.
Хто ў нашы дні перамог
Лютымі зловамі шкодзіць—
Штурмам прыбою разводзьдзя
Зломім на нашых шляхох
У нашым вялікім паходзе.
Сілай магутнаю рушымся біцца—
У бой—
Грамадой,
Штурмавой,
Бальшавіцкай.
Гукнем наступнаму дню
З гонарам на рыштаваньнях:
Наша жыцьцё—што ўсход сьвітань
ня,
Яго маладому разьліву—агню
Слава і песьні змаганьня.
Сілай магутнаю рушымся біцца—
У бой—
Грамадой,
Штурмавой,
Бальшавіцкай.

КОМСАМОЛ


на зямлі, пад зямлёй, на вадзе, пад вадой, у паветры

ЗМАГАЕЦЦА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ, ЗА ЯЕ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ

На чырвонай варце

(Гутарка з камандзірам падшэфнага беларускаму комсамолу лінейнага карабля „Парыская комуна"—т. Летавета)

...ўдзелу ў другой сэсіі ЦВК ...ССР прыехаў камандзір пад...га беларускаму комсамолу ...га карабля „Парыская ко-



Расьце і мацнее морскі флёт, ён стаіць на варце савецкіх рубяжоў.

„Нас клікала мора, мы далі на мора" сваіх лепшых сыноў.

Пэўныя абавязкі ўзяты ЛКСМБ перад падшэфным лінкорам „Парыская Комуна". Выканаць іх—справа нашага гонару.

...на"—т. Летавета. У гутарцы з ...і супрацоўнікам т. Летавета ...дзяліўся вялікімі посьпехамі ў вучобе аднаго з буйнейшых ...аў Чырвонага флёту, раска...ў аб стане шэфства і сувязі беларускага комсамолу з падшэфным асабовым складам гіганта...ія.

т. Летавета ўказаў на вялікае ...ічнае і экономічнае значэньне, якое мае для нас Чорнае мора—з важнейшых рубяжоў з ...апіталістычным сьветам—і ролю „Парыскай комуны" у абароне гэтага рубяжа.

„Савецкая Беларусь,—гаворыць ...—знаходзіцца таксама на мяжы ...капіталістычнымі краінамі і ...першаю выступіць на абарону ...атаўшчыны сусьветнага пролетарыяту—СССР. Таму шэфства беларускага комсамолу над нашым ...караблём набывае вялікае палітычнае значэньне, узьнімаючы баявы ...дух, моральны стан, вывучку байцоў, усьведамленьне адказнасьці ...ўсяго асабовага складу карабля".

...Баявая гатоўнасьць і дысцыпліна байцоў карабля стаяць на належнай вышыні, і чым больш абвастраюцца міжнародныя адносіны, чым больш узрастае ваенная небясьпека, тым вышэй узьнімаюцца

колькасныя і якасныя паказчыкі гатоўнасьці карабля накіраваць сваю грозную зброю на ўсіх, хто насьмее напасьці на Савецкі саюз.

На вясеньнім усесаюзным конкурсе РСЧА па рацыяналізацыі і вынаходніцтву мы занялі першае месца. Беларускі комсамол павінен ведаць герояў і ўдарнікаў гэтага конкурсу. Вось яны. Па артылерыі: галоўны старшыня Шылаў, старшыня Кавалёў; па ўмацненьню жывучасьці карабля: галоўны старшыня Паршэня; па экономіі паліва і палепшаньні механізмаў карабельнай службы: галоўны старшы-

Комсамол—шэф усеабучу

Адсталая, экономічна-прыгнечаная Беларусь у мінулым павінна да 1-га мая 1932 году стаць краінай суцэльнай пісьменнасьці.

— Жалезнай воляй бальшавіцкай—мы гэтага дабʼемся сустрэчным комсамольскім.

Штодзённа змагацца за поўную рэалізацыю дырэктыў партыі аб сярэдняй і ніжэйшай школе, дабіцца конкрэтных паказчыкаў на гэтым фронце—наш абавязак.

ня Жук і старшыня Дземчанка. Усе гэтыя героі-ўдарнікі прадстаўлены да ўзнагароды і прэміяваньня. Усе вызначаныя вышэйшым камандаваньнем заданьні ў галіне баявой падрыхтоўкі выкананы з посьпехамі і атрымалі высокую ацэнку. Мы ўзялі першае месца па масавай працы. Узьнялася баявая дысцыпліна байцоў. Колькасьць дысцыплінарных праступкаў, у параўнаньні з мінулым годам, зьменшылася больш як у 3 разы.

Увесь асабовы склад карабля ахоплен ударніцтвам і соцспаборніцтвам. Шырока ўкаранілася ў практыцы індывідуальнае і групавое спаборніцтва байцоў.

На аснове соцспаборніцтва і ўдарніцтва, а таксама ўдзелу ў рацыяналізацыі вялікай колькасьці радавога і вышэйшага складу значна павышана баявая магутнасьць карабля. Посьпех аднэй баявой адзінкі зьяўляецца сьвятам і посьпехам усяго асабовага складу карабля.

Далей т. Летавета адзначае, што за апошні час аслабла сувязь беларускага комсамолу з падшэфнымі. Толькі некаторыя організацыі (Гомель, Віцебск) яшчэ трымаюць пісьмовую сувязь. Беларускі комсамол і мы прынялі па шэфству шмат абавязкаў, але гэтыя абавязкі застаюцца не праверанымі. Яшчэ дагэтуль мы не абмяняліся вопытам барацьбы за выкананьне іх.

Увесь беларускі комсамол і насобныя яго буйныя, у асаблівасьці пролетарскія організацыі, павінны зараз-жа правесьці праверку і самаправерку становішча шэфства і сувязі з караблём, выкананьня ўзятых абавязкаў. „Чырвоная

Комсамол—шэф паветр флёту

„Баяздольнасьць паветранага флёту ў многім залежыць ад асабістага яго складу. Хто будзе абслугоўваць нашы паветраныя сілы ў якасьці лётнікаў, бортмэханікаў, у якасьці інжынэраў, работнікаў аэродромаў,—ад гэтага ў значнай меры будзе залежыць і рост і посьпехі нашага Чырвонага паветранага флёту" (К. Варашылаў).

„Тысячы лётнікаў-комсамольцаў і ніводнага комсамольца-лятуна".

(М. Кальцоў).

Зьмена" павінна ўзмацніць сувязь з нашай карабельнай газэтай „На вахце".

Гэроіка комсамольскіх будняў

Мы новы сьвет будуем

Комсамол вёскі за 13 год існаваньня ўпісаў не адну слаўную старонку ў гісторыю барацьбы за соцыялізм, за генэральную лінію партыі, за перадзелку дробна-ўласьніцкіх гаспадарак у буйныя соцыялістычныя.

У клясавай барацьбе рос і гартаваўся вясковы комсамол.

1931 год. На фронце колектывізацыі аграмадныя трофэі. Асноўныя масы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, зразумеўшы правільнасьць генэральнай лініі партыі, абʼядналі вузкія загоны сваіх дробна-ўласьніцкіх гаспадарак у колгасы. Больш як на 50 проц. колектывізавана Беларусь.

Стварыліся новыя умовы. Паўсталі другія задачы. На сучасным этапе колгаснага будаўніцтва партыя ва усю шыр паставіла цэнтральнаю, галоўнаю задачай—організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў.

І комсамол рынуўся ў бойку.

Савецкая Беларусь—краіна жывёлагадоўлі, краіна тэхнічных культур. Спэцыялізацыя сельскай гаспадаркі азначае перш за ўсё ўздым таварнасьці сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

Вось чаму комсамолія саўгасу „Комсамольская праўда" (Аршанскі раён) ставіць сабе задачу дагнаць і перагнаць амэрыканскага капіталістычнага фэрмэра. Комсамолія кажа: — Нам па плячу „тона-апарос", тут трэба толькі барацьба і комсамольская воля — і на ўвесь СССР кідае лёзунг: „То-

ФЗВ

Дзецішча Кастрычніка, народжанае комсамолам, выхоўвае сьвядомыя соцыялістычныя кадры для растучай прамысловасьці БССР.

У 75 фабзавучаў на Беларусі навучаецца 19.219 чал. У апошнім 4-м годзе пяцігодкі колькасьць фабзавучаў павялічыцца да 234, а вучняў —на 73,6 проц.

на мяса з апаросу ў 6 месячным узросьце, і ня менш". Маладыя бальшавікі „Комсамольскай праўды" выклікаюць на спаборніцтва усе фабрыкі мяса. Лёзунг падхопліваюць масы і ператвараюць ў практыку. Ініцыятары ўсесаюзнага спаборніцтва ня любяць дарэмна кідаць у паветра фразы. Засукаўшы рукавы, яны змагаюцца за „тону-апарос". Вынікі відавочны. Пераведзены сьвінарнікі на прогрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну, на гаспадарчы разрахунак. Пераводзяцца на гаспадарчы разрахунак асобныя брыгады. Організоўваецца соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Комсамольскі сьвінагадоўчы цэх саўгасу—лепшы цэх. Адыход маладняка даведзен да 3 проц. А па ўсім саўгасе—да 6 проц.

Вось героі барацьбы за „тону-апарос": сакратар ячэйкі Гольцаў, заатэхнік комсамолец Несьцераў, комсамолкі — Беразень Марыля і Сурвіла Стася.

Комсамольцы комуны БВА, Любаньскага раёну, добра ўцямілі, што кармовая база, сілос, вырашае посьпех разьвіцьця соцыялістычнай жывёлагадоўлі. У комуне быў прарыў. Зацягнулі сілосаваньне. Пуставала агромная сілосная вежа. Комсамольцы абвясьцілі 10-цідзенькі штурму прарыву. Восень. Мокра, грязна. Але бязупынна, і ўдзень і ўночы, пры электрычным сьвятле, уся ячэйка ўдарнаю брыгадай штурмавала прарыў, пакуль ня выканалі плян на 100. Кармовы перакон быў узят. Зараз у комуне 50 комсамольцаў, а да прарыву было 20. Ячэйка—сапраўдны організатар колгаснай вытворчасьці. Сакратар ячэйкі—Кулакоўскі. Героі ўдарнікі—ўсе 50. 20 чал. прэміявана.

Два ўдарнікі-комсамольцы (ячэйка „Чырвоны араты", Ельскага раёну), вылучаныя даглядаць за колгасным стадам, абвясьцілі сябе ўдарнікамі: „Каровы, якіх даглядаюць комсамольцы, будуць лепшымі каровамі ў колгасе". Словы не разышліся са справай. У хуткім часе 12 дойных кароў за 10 дзён правільнага карміленьня і догляду павысілі ўдой на 70 літраў, перагнаўшы іншых на 5 літраў малака. Такім чынам комсамольскія каровы па волі комсамоліі, сталі лепшымі ў колгасе.

У сьвінагігаңце Беларусі „Вішнёўка"—прарыў—на сьвінарніках чума, адыход. І толькі адзін сьвінарнік, за якім даглядала комсамолка Параска, даваў добрыя паказчыкі: адыход дав дзен да 2 проц. Ударніцу Параску два разы прэміявалі, а зараз вылучылі бібліотэкаршай саўгасу. Для ліквідацыі прарыву ячэйка паслала дзесяткі комсамольцаў.

Гэта—маленькая горстка фактаў герoікі барацьбы колгаснага комсамолу за тэмпы, за пляны, за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, за генэральную лінію

Комсамол — шэф электрыфікацыі

„Савецкая ўлада плюс электрыфікацыя — ёсьць комунізм" (Ленін).

У барацьбе за ажыцьцяўленьне ленінскай формулы шэфствуе комсамол над лямпачкай Ільліча.

Змагаемся і будзем змагацца за электрыфікацыю ўсёй краіны, за торп, за электрасварку, за павялічэньне „косынусу Фі", за аўладаньне тэхнікай электрыфікацыі

партыі. Комсамол вырас колькасна і якасна. Вырасла ўдзельная вага колгаснага комсамолу ва усіх галінах колгаснай вытворчасьці.

Гэтая гэроіка завецца комсамольскімі буднямі соцыялістычнага будаўніцтва.

А. Усьмінскі.

Чыгунка ўзята на буксір

...Магілеве, як і ў шмат іншых ...ох Беларусі, вядзецца так: га...ая комсамольская організацыя ...сваім жыцьцём, чыгуначная ...комсамолія—сваім.

...шклоўскай ф-цы перабудоў...ваюць работу, на чыгунцы працу...юць па-старынцы.

...прарывы ў комсамольскай ра...боце на чыгунцы комсамольцы ...шоўкавай не адказваюць.

...гэтага часу існуе разрыў паміж гарадзкой і чыгуначнай комсамольскімі організацыямі.

...мэтай зьнішчыць гэты разрыў і організаваць масавую дапамогу комсамольцам чыгункі, Магілёўскі РК ЛКСМБ па ініцыятыве выязной рэдакцыі і колектыву цягі, на агульна-гарадзкой нарадзе сакратароў ячэек і колектываў паставіў ...на колектыву цягі.

...Комсамольцы цягі распрацавалі соцыялістычны рахунак колектывам буйнейшых прадпрыемстваў і ўсей організацыі. Яны патрабавалі дапамогі ў сваячасовым выкананьні заказаў транспорту, у перабудове комсамольскай работы па асобных галінах і г. д.

Упяршыню 120 чалавек сакратароў ячэек абгаварвалі становішча колектыву чыгункі. Нават у справах ужо адчуваўся некаторы пералом ў адносінах да чыгункі.

У сваей пастанове нарада абавязалася:

Організаваць сваячасовае выкананьне заказаў транспорту па адліўцы запасных частак—клапанаў, рыкур, тормазных цыліндраў і г. д. („Чырвоны адраджэнец").

Організаваць дапамогу матарʼяламі і запаснымі часткамі: скура манжэтныя рэмні, клінгерыт медзь, сталь і г. д. (Магвалакнабуд, завод імя Сталіна, сампрамсаюз і г. д.)

Шоўкавая фабрыка і завод Сталіна абавязаліся організаваць на сваіх ветках пасты для паскарэньня разгрузкі вагонаў.

Каб узмацніць работу на чыгунцы, РК ЛКСМБ мобілізуе 15 комсамольцаў і 2 рахункаводы.

— Для дапамогі колектыву цягі і ячэйцы руху у перабудове сваей работы комсамольскія колектывы вылучаюць спэцыяльныя сталыя брыгады. Так, шоўкавая фабрыка, якая мае ўзорныя паказчыкі перабудовы комсамольскай работы, вылучае брыгады па перабудове работы ячэек; Пэдтэхнікум і Пэдʼінстытут вылучылі ў дапамогу брыгады па рэалізацыі пастановы ЦК аб сярэдняй школе, політасьветтэхнікум—па перабудове політвучобы, ячэйка друкароў—па вайсковай рабоце, ячэйка ЦРК па рабочаму забясьпечаньню, „Чырвоны адраджэнец"—па піонэрработе і г. д.

Вопыт Магілеўскага райкому комсамолу сябе апраўдаў і павінен быць перанесен у Менскую, Віцебскую, Гомельскую, Аршанскую і інш. організацыі.

Зьнішчэньне разрыву паміж гарадзкой і чыгуначнай комсамольскай організацыямі—гэта конкрэтная рэалізацыя пастановы пленуму ЦК КП(б)Б і ЦКК аб чыгуначным транспорце у падрыхтоўцы да 4 пленуму ЦК ЛКСМБ.

Э. Каганская.

Шыбеніца не затрымае гэроічнай барацьбы комсамолу Заходняй Беларусі

Наш комсамол жыве і працуе на рубяжы капіталістычнага сьвету. У Савецкім Саюзе хуткімі тэмпамі будуецца соцыялістычная гаспадарка, поўнасьцю ліквідавана беспрацоўе, расьце культурны ўзровень рабочых і сялянскіх мас. У капіталістычных краінах — востры экономічны крызіс, 40 мільённая армія беспрацоўных, шыбеніцы і турмы для рэволюцыйных рабочых і сялян. У такіх умовах прыходзіцца працаваць комсамолу капіталістычных краін і пад кіраўніцтвам комуністычных партый організоўваць моладзь на барацьбу з капіталам.

Кожны член ЛКСМБ павінен ведаць пра гэроічную барацьбу сваіх замежных братоў і ўсімі сіламі дапамагаць яму дабіцца таго, чаго дабіўся пролетарыят нашай краіны.

Беспрацоўныя самі бяруць хлеб

„Газэта Варшаўска" паведамляе што на днях у Станіславове адбылася бурная дэмонстрацыя беспрацоўных і рабочых, якія дамагаліся хлеба і працы. На вуліцах Галіцкай беспрацоўныя напалі на воз з хлебам і пачалі разьбіраць хлеб.

У Амэрыцы налічваецца больш 10 мільёнаў беспрацоўных. Становішча іх жахлівае. Ніякай дапамогі ад дзяржавы яны не атрымліваюць. Калі-ні-калі ім выкідаюць жабрацкую падачку. Яшчэ больш пагоршылася становішча беспрацоўных з наступленьнем зімы. Без цёплай вопраткі, без кватэр, без хлеба мільёны і мільёны людзей кінуты капіталізмам на паступовае выміраньне.

Амаль 40 проц. кватэр у небасхробах буйнейшых гарадоў Амэрыкі—Чыкаго, Нью-Ёрку, Вашынгтону,—пустуюць. А мільёны рабочых выкідаюцца на вуліцу.

Тысячы тон пшаніцы, кавы і інш. харчовых продуктаў ідуць у топкі паравозаў, выкідаюцца ў мора, а мільёны людзей выміраюць ад галоднай сьмерці. Усяму гэтаму вінавата капіталістычная сыстэма, якая павінна быць і будзе зьнішчана рэволюцыйным пролетарыятам.



На здымку справа: 40-паверхавы небасхроб у горадзе Чыкаго, дзе 40 проц. кватэр пустуюць.
На здымку зьлева: „Кватэра" 69-ці гадовага амэрыканскага рабочага, які абклаў сваю „кватэру" сен каб не замерзнуць зімою

Пад ботам польскага фашызму

(Ліст з Заходняй Беларусі)

Ужо 11 год, як Заходняя Беларусь знаходзіцца пад ботам беларускае фашысцкае Польшчы. За гэты невялікі гістарычны час Заходняя Беларусь ператварылася ў руіны. Жахлівае становішча рабочых на гарадох, якія амаль усе ходзяць без працы, без усякіх сродкаў да існаваньня. Масы беспрацоўных павялічваюцца з кожным днём, асуджаныя на галодную сьмерць.

Ня лепшае становішча сялянскай беднаты і батрацтва. Аграрны крызіс асабліва абрушыўся на бядняцкія і серадняцкія гаспадаркі. Шматлікія падаткі выключна кладуцца на плечы беднаты і серадняцтва. Падаткі часта перавышаюць вартасьць сялянскай гаспадаркі ў некалькі разоў. Да падаткаў далучаюцца шматлікія штрафы. Аграрная політыка фашысцкага ўраду скірована ў бок узмацненьня абшарніцкага і кулакоў, за кошт працоўнага сялянства. Сялянская беднята даведзена да апошняй ступені ўбоства. У сувязі з гэтым па вёсках растуць масавыя стыхійныя выступленьні супроць фашысцкага ўраду.

Палаюць абшарніцкія гаспадаркі, гараць дзяржаўныя лясы, часьцяком ламаюць на чыгунке на тэлефонных лініі і г. д. Абшарнікаў, кулакоў, —агентаў фашысцкага ўраду—сяляне забіваюць. Такі выпадак меў месца на Заходняй Беларусі сяляне сьмяротна паранілі старшыню абшарніцкай організацыі—графа Юндзіла.

Усе стыхійныя выступленьні працоўнага сялянства ЗБ компартыя бярэ пад сваё кіраўніцтва, організоўвае іх у масавыя выступленьні супроць фашысцкага ўраду. Лёзунг компартыі „Ні гроша ўраду голаду, тэрору і вайны" ўвасоблены ў жыцьцё. Шмат на якіх вёсках ЗБ працоўнае сялянства ня плаціць ні падаткаў, ні штрафу, ні выходзяць на шарваркі. Такія факты мы маем на ўсім Берасьцейскім і іншых павятах, дзе сялянства дае організаваны адпор экзэкутарам.

У Кобрынскім, Валчынскім, Вілейка-літоўскім і іншых раёнах комсамольцы разгарнулі шырокую організацыю сялянства на барацьбу з экзэкутарам і паліцыяй. На ўсіх вёсках організаваны дружыны самаабароны. Калі ў вёску зьяўляецца секвестратар і паліцыя, чырвоныя ганцы склікаюць дружыны самаабароны і уступаюць у бой з паліцыяй. У Валчынскім раёне пад час сутычкі з сялянамі паліцыя мусіла адступіць. На другі дзень у гэтыя самыя вёскі прыбыло некалькі карных атрадаў і жорстка расправіліся з сялянствам: нішчылі гаспадаркі, арыштоўвалі катавалі. Агульная лічба арыштаваных перавышала 100 чал. Тады компартыя і комсамол разгарнулі кампанію за вызваленьне ўсіх арыштаваных. Напорам сялянства паліцыя была змушана арыштаваных звольніць.

Хваля абурэньня працоўнага сялянства супроць окупанцкага ўраду ахапляе ўсю Зах. Беларусь.

Сялянства організуецца, солідарызуецца з гарадзкім пролетарыятам і пад кіраўніцтвам компартыі рыхтуецца да апошняга, рашучага бою за ўладу.

Б.

Чырвоныя сьцягі на вуліцах Варшавы

Гэтымі днямі, у знак протэсту супроць крывавага тэрору паліцэйшчыны, супроць забойства т. Кохана на вуліцах Варшавы было вывешана некалькі чырвоных сьцягаў. На Дзікай вуліцы быў вывешаны вялікі жалобны чырвоны сьцяг, па баках якога гарэла 2 факелы. На ўзьняты сьцяг з вялікай цікавасьцю глядзелі праходзячыя рабочыя і чыталі лёзунгі, якія заклікалі да барацьбы супроць белага тэрору ў Польшчы. Калі паліцыя пачала зьнімаць сьцяг дык набегла шмат рабочых і пачала не даваць здымаць, Быў выклікаены вялікі атрад паліцыі, які разагнаў рабочых,



Нямецкі дэлегат комсамолец Карл сярод комсамольцаў з-ду „Камунар" (Менск)

Арышты ў літоўскіх школах у Вільні

Нацыянальна - вызваленчае змаганьне прыгнечаных народаў у Польшчы набывае ўсё большыя памеры. Фашысцкі ўрад імкнецца ўсімі сіламі задушыць нацыянальна-вызваленчы рух і дзеля гэтага пускае ў ход усе свае магчымасьці Разграміўшы ТБШ у Вільні і закрыўшы ўсе беларускія школы, окупанцкі ўрад вядзе наступленьне на школьніцтва і на культурна-асьветныя організацыі іншых прыгнечаных нацыянальнасьцяй у Польшчы. За апошнія часы шмат закрыта ўжо літоўскіх і яўрэйскіх школ. Фашызм на гэтым, аднак, не спыняецца. Рэпрэсіі працягваюцца.

Як паведамляе „Газэта Варшаўска", у адной з літоўскіх школ Вільні паліцыя гэтымі днямі правяла масавыя арышты сярод вучнёўскае моладзі. Арыштавана некалькі дзесяткаў літоўскіх вучняў, якія абвінавачваюцца ў прыналежнасьці нібы да комсамолу і ў распаўсюджваньні комуністычнай літаратуры, варожай окупанцкаму ўраду. Літоўскія вучні протэставалі проць нацыянальнага ўціску, прыватнасьці супроць новаўведзенага ва ўсіх літоўскіх школах рэжыму, мэта якога—цолёнізаваць літоўскую моладзь.

Комсамол Заходняй Беларусі пасьля зьезду

Далейшае паглыбленьне экономічнага крызісу ў Польшчы стымулюе нарастаньне прадпасылак крызісу рэволюцыйнага. Рэволюцыйная барацьба рабоча-сялянскіх мас узьнімаецца на новую, вышэйшую ступень. Гэта ставіць перад партыяй і комсамолам Польшчы надзвычайна адказныя задачы. Трэба ўзьняць актыўнасьць партыі і комсамолу на такую вышыню, якой вымагае цяперашні пэрыод перарастаньня частковых баёў у рашучыя бойкі за ўладу. Трэба як найхутчэй ліквідаваць адставаньне організацыйнага ахапленьня партыяй і комсамолам політычнага росту мас. Трэба забясьпечыць штодзённае конкрэтнае бальшавіцкае кіраўніцтва барацьбою рабочых і сялян. Ад гэтага залежыць далейшы рост рэволюцыйнай актыўнасьці мас, ад гэтага залежыць пераход сеньнешніх боек у рэволюцыйнае контрнаступленьне разгорнутым фронтам.

Адказнасьць вучастку, якім зьяўляецца Заходняя Беларусь, паглыбляе важнасьць гэтай задачы перад КСМ ЗБ. Першы зьезд КСМ ЗБ, які адбыўся ў красавіку бягучага году, паставіў перад усёй організацыяй неабходнасьць перабудовы працы ў адпаведнасьці з новымі задачамі.

І сапраўды. За той адрэзак часу, які аддзяляе нас ад 1-га зьезду, КСМ ЗБ відавочна сваю работу перабудоўвае. Ужо ёсьць рад буйных організацыйных і політычных дасягненьняў.

Ліквідацыя элемэнтаў прававапортуністычнай практыкі, сэктанцтва „левага" авантурызму—прынесла ў організацыйных адносінах амаль падвоеньне радоў саюзу, а ў політычных—вялікі рост популярнасьці і аўторытэту комсамолу ў масах рабочасялянскае моладзі.

Першы зьезд паставіў у цэнтры задачу барацьбы з небясьпекай інтэрвэнцыі; штодзённую антываенную работу.

Антываенная работа ідзе ў першую чаргу па лініі мобілізацыі шырокіх мас рабочасялянскай моладзі супроць небясьпекі вайны. З гэтым увязваецца кожны момант комсамольскай работы.

Шырока популярызуючы соцыялістычнае будаўніцтва ў Савецкім Саюзе і Савецкай Беларусі, популярызуючы дасягненьні гэтага будаўніцтва—КСМ ЗБ організуе працоўную моладзь вакол лёзунгу абароны СССР і БССР.

Складанаю часткай антываеннай работы КСМ зьяўляецца самая рашучая барацьба з фашысцкімі. соцыял-і нацыянал фашысцкімі маладзёжнымі організацыямі, самая рашучая барацьба з пацыфісцкімі фразамі соцыял-фашызму, бязьлітаснае іх дэмаскаваньне. першы зьезд паставіў перад КСМ ЗБ конкрэтную задачу: у бліжэйшы час ліквідаваць цалкам уплыў фашысцкай маладзёжнай організацыі Стральца сярод працоўнае моладзі, у першую чаргу сярод моладзі рабочай, батрацкай і бядняцкай. Комсамольскія організацыі Зах. Беларусі ўжо шмат дзе прыступілі і з посьпехам выконваюць задачу, пастаўленую перад імі зьездам.

Асабліва важным вучасткам зьяўляецца антываенная работа КСМ сярод допрызыўнікаў. Комсамол змагаецца за тое, каб рабоча-сялянская моладзь была заўсёды гатова ў патрэбную хвіліну павярнуць вінтоўкі супроць свайго клясавага ворага. Кожная ячэйка КСМ ЗБ адказвае за організацыю допрызыўнікаў сваёй фабрыкі, маёнтку, вёскі. У апошні час асабліва шырока практыкуецца організацыя рэволюцыйных провадаў прызваных у армію. Рэволюцыйныя провады ператвараюцца ў масавыя дэмонстрацыі салідарнасьці, у масавыя дэмонстрацыі абароны СССР.

Інтэнсыўную працу комсамол вядзе і ў радох самой арміі. Падтрымліваючы і організуючы барацьбу салдат за іх частковыя патрабаваньні, організуючы барацьбу супроць афіцэрскага тэрору,—комсамол мобілізуе салдацкія масы на небясьпеку вайны, кідаючы лёзунг: за абарону СССР. Комсамол завязвае з войскамі самыя цесныя зносіны. Пранікаючы ў кожны полк, у кожную роту, комсамол выконвае лёзунг другога зьезду КСМ Польшчы—„Кожны комсамолец мае прыяцеля салдата". Комсамол організуе братаньне салдат з рабочымі і сялянамі. Популярызуюцца самым шырокім чынам выпадкі адмаўленьня салдат страляць у дэмонстрацыі, у сваіх братоў (Карэлічы). Работа комсамолу ў арміі дае пажажныя вынікі: зьяўляецца магутным штуршком да новых перамог на гэтым вучастку барацьбы.

(Працяг будзе).

Гомель рапартуе

Цэкамол Палякову, Гуткіну, „Чырвонай Зьмене", Наркомфіну Хацкевічу.

Гомельскі комсамол, сумесна з пролетарыятам Гомеля, пад кіраўніцтвам гаркому партыі, разгарнуў бальшавіцкую барацьбу за фінплян. З гонарам рапартуем аб выкананьні гадавога заданьня на 102,67 проц., квартальнага—на 102,1 проц. Посьпехі замацоўваем. Працягваем барацьбу за фінплян.

Сэкратар гаркому КАМІСАРЧЫК.

Ганаровае месца перадавіком

За лепшую падрыхтоўку да пленуму ЦК, па асноўных пытаньнях абвесткі дня, ЦК рашыў прэміяваць наступных сэкратароў ячэек—выклікаць іх на пленум ЦК: сэкратара ячэйкі саўгасу „Вэйна"—Магілеў, саўгасу „Комсамольская Праўда"—Ворша, комуны БВА—Любань, сэкратара колектыву цягі—Віцебск, сэкратара колектыву заводу Ланцуцкага—Гомель, сэкратара цэхячэйкі дэпо—Магілеў, сэкратара комсамольскай школы—Полацак, сэкратароў колектываў „Бальшавік", „Акцябр"—Менск.

Адказны рэдактар Л. ПЭРЛІН

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карл. Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2225.